ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (181) | Субота, 16 сакавіка 1974 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# ДА НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ, КАМСАМОЛ!

З дня ўтварэння Ленінскі камсамол Беларусі быў і застаецца актыўным памочнікам і рэзервам Камуністычнай партыі рэспублікі. Таму XXV з'езд ЛКСМБ, як адзначыў у сваёй прамове другі сакратар ЦК КПБ А. Н. Аксёнаў, стаў вялікай падзеяй у жыцці ўсёй Беларускай рэспублікі.

З вялікай цеплынёй і сардэчнасцю, шчырымі ўсмешкамі і кветкамі сустрэла сталіца Беларусі — горад Мінск —пасланцаў усіх абласцей рэспублікі — дэлегатаў XXV з'езда ЛКСМБ, а таксама гасцей — дэлегацыі Саюза моладзі Харватыі, падшэфнай часці Паўночнай групы войск, двойчы Чырвонасцяжнага Балтыйскага флоту.

Пад скляпеннямі акругованага Дома афіцэраў 27 лютага з самай раніцы не змаўкалі звонкія маладыя галасы, песні, уваскрасаючыя этапы вялікага шляху, слаўную гісторыю Ленінскага камсамола.

У дзесяць гадзін раніцы першы сакратар ЦК ЛКСМБ У. І. Падрэз аб'явіў XXV з'езд Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі адкрытым.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі дэлегаты і госці прывітанне ЦК Камуністычнай партыі Беларусі XXV з'езду ЛКСМБ.

У справаздачным дакладзе ЦК ЛКСМБ прааналізавана работа камітэтаў камсамола рэспублікі ва ўсенароднай барацьбе за выкананне галоўнай задачы дзевятай пяцігодкі — забеспячэнне значнага ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове высокіх тэмпаў развіцця сацыялістычнай вытворчасці, павышэння яго эфектыўнасці, навукова-тэхнічнага прагрэсу і паскарэння росту прадукцыйнасці працы.

Шмат увагі ў дакладзе ўдзелена студэнцтву. Адзначана, што за апошнія тры гады вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю ў рэспубліцы атрымала 185 тысяч чалавек. Павысіўся сярэдні працэнт паспяховасці ў вну. Цяпер ён роўны 91,8 працэнта. У асобных вну, у тым ліку і ў нашым універсітэце, ён значна вышэйшы.

Між тым і перад нашай камсамольскай арганізацыяй стаіць яшчэ шмат нявырашаных пытанняў. Гэта, перш за ўсё,—як зменшыць «адсеў» першакурснікаў, павысіць іх паспяховасць. Нас павінна ўстурбаваць і тое, чаму яшчэ нямала двоечнікаў і троечнікаў? Мы абавязаны павесці рашучую барацьбу з яшчэ бытуючымі сярод асобнай моладзі мяшчанскімі ўяўленнямі, нібыта студэнцкае жыццё — гэта пара вясёлага раздолля, бяспекі. Трэба зацвердзіць як вышэйшую меру вартасці асобы студэнта — упартую, сістэматычную, мэтанакіраваную працу па авалодванню навуковымі ведамі, фарміраванню ў сабе высокіх грамадзянскіх якасцей, ідэйнай перакананасці.

Патрэбы народнай гаспадаркі, навукі і культуры, перспектыва іх развіцця, узрастаючыя патрабаванні да высокакваліфікаванага сучаснага спецыяліста вылучаюць на парадак дня важную задачу — далучыць да навукова-даследчай работы кожнага студэнта, зрабіць яе састаўной часткай вучэбнага працэсу ў вышэйшай школе.

З году ў год удасканальваецца сістэма ідэйна-палітычнай работы са студэнцкай моладдзю. Яна ўключае ў сябе глыбокае вывучэнне гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі, навуковага камунізму ў рамках вучэбнага працэса, даследаванні па праблемах грамадска-палітычных навук, набыццё арганізатарскіх навыкаў, удзел у грамадска-палітычнай практыцы, у агітацыйна-прапагандысцкай рабоце. Дзейсным сродкам павышэння сацыяльнай актыўнасці моладзі сталі Ленінскія залікі і ўрокі.

Такім чынам, уся сістэма ідэйна-палітычнай работы прадстаўляе чоткі, паслядоўны працэс выхавання. Тут мы таксама вымушаны патрабавальна і прынцыпова гаварыць пра нявырашаныя праблемы.

Нам трэба больш увагі ўдзяляць сваім падшэфным камсамольцам і піянерам школ, домакіраўніцтваў, дзіцячым пакоям міліцыі і асабліва сельскім школам. Недастаткова яшчэ працуюць у Кіраўскай, Халочскай і Дудзічскай школах Чачэрскага раёна камсамольцы-шэфы механіка-матэматычнага, біёлага-глебавага факультэтаў.

Камсамольскім арганізацыям названых факультэтаў, Савету маладых вучоных, камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта трэба ўсебакова абдумаць, што мы можам зрабіць для выканання пастаўленай з'ездам ЛКСМБ задачы — стварэння да 1975 года навуковых аб'яднанняў школьнікаў у вобласці.

У справаздачным дакладзе, у выступленнях дэлегатаў з'езда і асабліва ў прамове другога сакратара ЦК КПБ тав. Аксёнава А. Н. шмат цёплых слоў сказана ў адрас студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Адначасова пастаўлены канкрэтныя задачы па далейшаму развіццю і ўдасканальванню фізкультурна-масавай, аздараўленчай і спартыўнай работы сярод моладзі, па паляпшэнню інфармацыйнай службы ў камсамоле і г. д.

Шырокія гарызонты камсамольскага дзеяння. Але за якія б справы не браўся камсамол, няхай то арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва, распаўсюджванне перадавога вопыту ці палітычная асвета, заўсёды ён мае дачыненне да маладога чалавека, чый характар толькі фарміруецца, а сацыяльны вопыт — невялікі. Таму, калі мы гаворым аб вялікіх справах, дык павінны памятаць кожную канкрэтную асобу, працаваць удумліва і творча.

З'езд камсамола Беларусі праходзіў напярэдадні XVII з'езда ВЛКСМ. Хутка мы будзем адзначаць і 50-годдзе з дня прысваення камсамолу імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Таму з'езд ЛКСМБ заклікаў кожную пярвічную, раённую, гарадскую і абласную арганізацыі дастойна сустрэць гэтыя знамянальныя падзеі ў жыцці Ленінскага камсамола, адзначыць іх новымі поспехамі ў працы, вучобе, творчасці і запэўніў Камуністычную партыю, Савецкі ўрад, ЦК КПБ, ЦК ВЛКСМ у тым, што двойчы ардэнаносны камсамол Беларусі на давер'е і клопаты партыі адкажа з'яднаннем сваіх радоў, самаадданай працай, вернасцю высокім рэвалюцыйным ідэалам.

**Т. ІЛЬЯНКОВА,**
**сакратар камітэта камсамола, дэлегат XXV з'езда ЛКСМБ.**

## ІМІ ГАНАРЫЦЦА ЎНІВЕРСІТЭТ



Студэнта чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта Аляксандра Ярмішына любяць і паважаюць усе студэнты. Гэтыя словы я напісала не выпадкова. Менавіта ў іх заключаецца ўсё тое, што характарызуе чалавека з самага лепшага боку. А самае галоўнае, натуральна, — гэта адносіны да цябе сяброў, знаёмых, інакш кажучы, людзей.

Для студэнта перш за ўсё важна паказваць прыклад стараннай вучобы. У гэтым сэнсе на Сашу можа раўняцца кожны: ён — Ленінскі стыпендыят. Не цураецца і грамадскай работы: з'яўляецца намеснікам сакратара камсамольскага бюро факультэта, рэдактарам насценнай газеты «Біёлаг». Плённа працуе Ярмішын і ў студэнцкім навуковым гуртку.

Нягледзячы на поспехі ў вучобе і навуковых даследаваннях, Саша ніколі не ганарыцца імі. Ён заўсёды сціплы, спагадлівы, гатовы ў любы момант прыйсці на дапамогу таварышу.

А. Ярмішын ясна бачыць пастаўленую перад сабой мэту. Папершае, гэта стаць высокакваліфікаваным спецыялістам, падругое, — выйшаўшы на самастойны шлях жыцця, як мага больш карысці прыносіць сваёй Радзіме.

**Л. ШЧАГРЭНАВА,**
**студэнтка чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта.**

На здымку: Ленінскі стыпендыят Аляксандр Ярмішын.

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета ўніверсітэта. Падведзены вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі на аддзяленні завочнага навучання. З дакладам выступіла прарэктар, дацэнт Т. П. Трацэўская.

У прынятай пастанове прадугледжваюцца меры для далейшага ўдасканальвання завочнай адукацыі ва ўніверсітэце.

На Вучоным савеце навуковыя кіраўнікі, прафесары В. Г. Герасімаў і А. С. Паламарчук выступілі са справаздачамі аб рабоце аспірантаў. Для аспірантаў першага года навучання Вучоны савет зацвердзіў тэмы дысертацый.

## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні адбылося чарговае пасяджэнне парткома. Абмеркаван шэраг надзённых пытанняў. Сярод іх — аб рабоце школы маладога лектара і шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт». Са справаздачамі выступілі кіраўнік школы маладога лектара, дацэнт Э. М. Энцін і член парткома, рэдактар газеты У. П. Балога.

Рабоце школы маладога лектара і рэдакцыі шматтыражнай газеты дадзена станоўчая адзнака. Разам з гэтым указана на істотныя недахопы. У прынятых пастановах намечаны канкрэтныя меры для ўдасканальвання падрыхтоўкі лектараў з ліку студэнтаў і адкрыццю новых секцый школы і для павышэння ролі шматтыражнай газеты ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі, калектыў выкладчыкаў і студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта шчыра віншуюць ЛЯШЧЫНСКУЮ Вольгу Аляксееўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук і жадаюць ёй далейшых поспехаў у працы і навуковых даследаваннях.**

## УШАНАВАННЕ ЮБІЛЯРА

Споўнілася 50 гадоў з дня нараджэння і 20 гадоў навукова-педагагічнай дзейнасці загадчыка кафедры эканомікі працы, дацэнта У. Д. Арэшчанкі. Ушанаванне юбіляра адбылося на Вучоным савеце эканамічнага факультэта.

Урачыстае пасяджэнне савета адкрыў дэкан факультэта, дацэнт І. П. Трацэўскі.

Пра жыццёвы шлях і навукова-педагагічную дзейнасць юбіляра расказала сакратар партыйнага бюро эканамічнага факультэта Н. В. Волкава.

Слова прадастаўляецца другому сакратару гаркома КПБ Б. М. Тамашову. Ён паведамляе аб тым, што ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння і за актыўную навукова-педагагічную працу і грамадскую дзейнасць У. Д. Арэшчанка ўзнагароджаны Ганаровай граматай Гомельскага абкома КПБ і абласнога Савета дэпутатаў працоўных, уручае юбіляру памятныя адрасы гаркома КПБ і Цэнтральнага райкома партыі.

Ад рэктарата і грамадскіх арганізацый памятны адрас У. Д. Арэшчанку ўручыў рэктар універсітэта Б. В. Бокуць.

Памятныя адрасы юбіляру былі ўручаны ад ўсіх факультэтаў універсітэта, асобных кафедр, ад Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, Гомельскага філіяла БПІ, ад калектываў некаторых заводаў горада, студэнцкіх груп, таварышаў па сумеснай рабоце.

Кранутыя цёплымі і шчырымі словамі, на пасяджэнні савета выступіў У. Д. Арэшчанка. Ён сардэчна падзякаваў за высокую адзнаку яго працы і запэўніў, што не пашкадуе сіл і энергіі для дасягнення яшчэ больш здабыткаў на навукова-педагагічнай ніве.

## У СВЕТ НАВУКІ





У той час, калі студэнты пятых курсаў ужо працуюць над дыпломнымі работамі, першакурснікі робяць першыя крокі ў краіну навукі. Яны настойліва авалодваюць ведамі, наведваючы лекцыі і практычныя заняткі ва ўніверсітэце.

НА ЗДЫМКАХ: практычныя заняткі па тапаграфіі праводзіць дацэнт М. І. Чычын са студэнтамі першага курса геафака; студэнты фізічнага факультэта, першакурснікі Уладзімір Дзмітрыеў і Віктар Мышкавец на практычных занятках у лабараторыі малекулярнай фізікі.

Фота А. Рудчанкі.

# ПРАБЛЕМЫ ПАЛЕССЯ

Нядаўна ў Мінску адбылося пашыранае пленарнае пасяджэнне Навуковага савета Акадэміі навук БССР па праблемах Палесся. Уступным словам пасяджэнне адкрыў віцэ-прэзідэнт АН БССР, акадэмік А. С. Махнач.

Пра каардынацыйную дзейнасць савета і задачах на бліжэйшы перыяд гаварыў у сваім дакладзе старшыня Навуковага Савета, член-карэспандэнт АН БССР С. Х. Будыка. Ён адзначыў, што ў вырашэнні палескай праблемы прымаюць удзел 180 чалавек, сярод якіх — 12 акадэмікаў, 20 дактароў навук, больш 100 кандыдатаў навук і звыш 30 спецыялістаў-практыкаў. 35 тэм па праблеме Палесся выконваюць 26 інстытутаў і вну рэспублікі, у тым ліку і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. Дакладчык прааналізаваў дзейнасць галаўных інстытутаў па дадзенай праблеме і работу савета па каардынацыі навуковых даследаванняў. С. Х. Будыка сказаў аб неабходнасці стварэння апорнай базы АН БССР на Палессі. Асноўнымі задачамі на бліжэйшы час, як адзначыў дакладчык, з'яўляюцца своечасовае завяршэнне навуковых даследаванняў у 1975 годзе, стварэнне камісій па ўкараненню вынікаў даследаванняў у вытворчасць, вызначэнне асноўных напрамкаў даследаванняў на наступную пяцігодку.

**ПАВЕДАМЛЯЕ ЧЛЕН СЕКЦЫІ**

У дакладзе міністра сельскай гаспадаркі Беларусі В. А. Казлова пра асваенне меліярацыйных зямель і асноўныя напрамкі развіцця сельскай гаспадаркі на Палессі падкрэслена важнасць Палескага рэгіёна ў эканоміцы рэспублікі.

Сельскагаспадарчая вытворчасць на Палессі будзе развівацца ў мяса-малочным напрамку. Жывёлагадоўля будзе пастаўлена на прамысловую аснову. Ужо цяпер ствараюцца прамысловыя жывёлагадоўчыя комплексы і міжгаспадарчыя вытворчыя аб'яднанні. У сувязі з гэтым важнае значэнне набывае інтэнсіфікацыя кармавытворчасці, стварэнне высокапрадуктыўных сенакосаў і пашаў.

Даклад начальніка Галоўпалессеводбуда В. В. Ярмоленкі быў прысвечан ходу і перспектывам меліярацыйных работ на Палессі. Дакладчык ахарактарызаваў агульны стан работ па меліярацыі і ўказаў на важнасць арашэння сельгасугоддзяў ва ўмовах Палесся, для чаго ствараюцца штучныя вадасховішчы. В. В. Ярмоленка падкрэсліў неабходнасць выкарыстання меліярацыйных зямель у лугаводчым напрамку, для чаго патрэбна стварыць доследную станцыю заліўнога лугаводства.

Выступіўшыя ў спрэчках удзельнікі пасяджэння адзначылі агульнадзяржаўную важнасць пераўтварэння Палесся, неабходнасць далейшага комплекснага і ўсебаковага вывучэння прыроды гэтага краю. У будучым пяцігоддзі праблемы Палесся стануць важнейшымі ў навукова-даследчай рабоце навуковых устаноў і вну рэспублікі.

У прынятай рэзалюцыі звяртаецца ўвага на далейшае развіццё навуковых даследаванняў беларускага Палесся, паляпшэнне каардынацыі праводзімых даследаванняў з мэтай павышэння іх эфектыўнасці.

**Л. САПЕГІН,**
**в. а. дацэнта кафедры батанікі, член секцыі «Флора і раслліннасць» Навуковага савета АН БССР па праблемах Палесся.**

# БЫЦЬ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

**АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ**

Кожнаму з нас, напэўна, добра памятныя ленінскія словы аб тым, што газета не толькі калектыўны прапагандыст і агітатар, але і калектыўны арганізатар.

Гэта датычыцца не толькі перыядычных выданняў, але і самых масавых — насценных газет.

На якім жа ўзроўні знаходзіцца насценны друк на механіка-матэматычным факультэце?

Спачатку гутару з сакратаром камсамольскага бюро мехмата А. Жураўлём.

— Усебакова асвяціць жыццё факультэта толькі ў адной насценгазеце, — гаворыць Аляксандр, — амаль што немагчыма. Таму яна выпускаецца на кожным курсе, за выключэннем пятага. Думаецца, што насценны друк спраўляецца са сваімі задачамі. Калі ж і сустракаюцца недахопы, дык стараемся іх выпраўляць.

Сапраўды, ля пакою дэканата побач з насценгазетай «Знание — сила» (орган дэканата, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый) я ўбачыў яшчэ чатыры, праўда, меншыя памерам.

Факультэцкую насценгазету рэдагуе студэнтка чацвёртага курса Ніна Казюліна. Пад яе кіраўніцтвам рэдкалегія паставіла ў цэнтр увагі пытанне аб павышэнні паспяховасці студэнтаў. Цікавае даследаванне правяла вучэбна-выхаваўчая камісія (ВКК) факультэта. Ёю выведзена залежнасць паміж наведваннем заняткаў і паспяховасцю. Аб атрыманых выніках сваім чытачам расказала газета. Графік даследавання паказаў, што, чым больш было прагулаў, тым ніжэй падаў сярэдні бал паспяховасці. Такія студэнты, як Лукашоў і Кавальчук, з-за частых пропускаў заняткаў не змаглі справіцца з вучэбнай праграмай і былі выключаны з універсітэта.

У газеце шырока асвятляецца работа гурткоў студэнцкага навуковага таварыства, адзначаецца яе вялікая карысць у паглыбленні ведаў студэнтамі. У сваім друкаваным органе будучыя матэматыкі абменьваюцца думкамі па розных пытаннях, адкрыта і прынцыпова вядуць размову пра нявырашаныя пытанні. Напрыклад, Ніна Казюліна піша:

«Двойкі ў сесію — гэта не толькі прыкмета няўмення і нежадання працаваць, гэта, хутчэй за ўсё, прыкмета таго, што мы не на сваім месцы».

Хацелася б, каб факультэцкая насценная газета з такой настойлівасцю змагалася за павышэнне паспяховасці студэнтаў і ў будучым.

Сярод насценгазет курсаў лепшае ўражанне пакідае «Дзень за днём», якую выпускаюць трэцякурснікі. У гэтай насценгазеце таксама шмат увагі ўдзяляецца паспяховасці студэнтаў, востра крытыкуюцца тыя, хто не наведвае лекцыі і, як вынік, «правальваецца» на экзаменах.

Для насценгазет факультэта ўласцівы агульны недахоп — няўменне афармляць іх. Яны выходзяць шэрымі, непрывабнымі. А матэрыялы газеты «Гарызонт», якую выпускаюць першакурснікі, друкуюцца нават без загалоўкаў. Гэта насценгазета, а таксама «Аптыміст» (чацвёрты курс) вельмі мала расказваюць пра жыццё студэнтаў, іх вучобу, адпачынак, быт і г. д.

Тое, што кожны курс факультэта мае сваю насценгазету, — вельмі добра. Але трэба дамагацца, каб усе яны адпавядалі свайму прызначэнню, былі па-сапраўднаму цікавымі і баявымі, шырока асвятлялі ўсе бакі студэнцкага жыцця і добра афармляліся.

**А. АЛЕСЕЎ,**
**наш кар.**



НА ЗДЫМКУ: на пярэднім плане адзін з лепшых студэнтаў мехмата трэцякурснік С. Гуз на лабараторных занятках.

## ПРЫСВЕЧАНАЕ К. Д. УШЫНСКАМУ

Днямі адбылося пасяджэнне кафедры педагогікі і псіхалогіі, прысвечанае 150-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага педагога Канстанціна Дзмітрыевіча Ушынскага. Былі зачытаны тры даклады. Выкладчык Вера Феапентаўна Дзянісава выступіла з дакладам «Грамадска-педагагічныя погляды і педагагічная сістэма К. Д. Ушынскага», дацэнт Клара Абрамаўна Камісарчык — «Псіхалагічныя погляды Ушынскага», студэнт 5 курса (гістарычнае аддзяленне) А. І. Сівачэнка — «Ушынскі аб маральным выхаванні».

З заключным словам выступіў загадчык кафедры, член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР І. Ф. Харламаў.

**ВЕСТКІ З ПРАКТЫКІ**

# ПЕРШАЯ СПРОБА

На працягу месяца студэнты-філолагі 4-га курса праходзілі педагагічную практыку ў 14-ці школах г. Гомеля. Мне хочацца расказаць як праходзіла гэтая практыка ў СШ № 15.

Тут працавалі 8 студэнтаў-практыкантаў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі Яўгена Ігнатавіча Балашова. Гэта — М. Ціханоўскі, В. Баранава, Г. Кандраценка, Л. Тальчук, Т. Пуканава і іншыя. Трое з іх былі замацаваны за восьмымі класамі, а астатнія — за чацвёртымі і пятымі.

Мы выканалі план-праграму, паспяхова справіліся з усімі заліковымі мерапрыемствамі. Было праведзена шмат аглядных і тэматычных палітінфармацый: пра становішча ў Чылі, савецка-кітайскія адносіны на сучасным этапе і іншыя. Праводзіліся этычныя гутаркі. Заліковымі таксама з'яўляліся піянерскія зборы і ранішнікі, камсамольскія сходы, канферэнцыі па пэўных кнігах.

У час практыкі мы сістэматычна правяралі дзённікі вучняў, наведвалі школьнікаў дома. Кожны з нас справіўся з навукова-метадычнымі рэфератамі, з напісаннем псіхолага-педагагічных характарыстык на вучняў. Для гэтага трэба было на працягу ўсёй практыкі сачыць за адным з вучняў, знаёміцца з яго асабовай справай, з бацькамі, жыццём і г. д.

Студэнты адносіліся да практыкі добрасумленна. Мы з вялікім захапленнем правяралі вучнёўскія сшыткі, займаліся з адстаючымі вучнямі па сваіх прадметах і нават самі давалі ўрокі. Ад нас патрабавалася вялікая эрудыцыя, напружанне фізічных і маральных сіл, знаходлівасць, а ў выпадках выхавання вучняў і арганізатарскія здольнасці.

Кіраўнік педпрактыкі, старшы выкладчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Вольга Іванаўна Філічава адзначыла, што сёлета практыка філолагаў прайшла ў параўнанні з мінулымі гадамі на самым высокім узроўні. Трэба з упэўненасцю сказаць, што ў гэтым вялікую ролю адыгралі падрыхтаваныя загадчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі, членам-карэспандэнтам АПН СССР Іванам Фёдаравічам Харламавым і ўпершыню адрукаваныя на ратапрынце «Планы-праграмы», якія прадугледжвалі заданні на кожны дзень.

...Усё зробленае на практыцы не прайшло бясследна. Мы навучыліся паводзіць сябе ў настаўніцкім калектыве, сярод вучняў, знайшлі з імі агульную мову, а галоўнае — адчулі прафесію педагога. Кожны з нас пераканаўся, ці правільны шлях абраў у жыцці. Гэты месяц быў і добрай падрыхтоўкай да вытворчай практыкі.

**К. УСОВІЧ,**
**студэнт 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

АБ ТВОРЧАСЦІ МАЛАДЫХ

# ТАЛЕНТ І НАСТОЙЛІВАСЦЬ

Паэт Міхаіл Ісакоўскі пісаў, што «вельмі многія з пачынаючых пісаць вершы, рашыўшыя ў чым бы тое не было зрабіцца паэтамі, працуюць усё ж такі дарэмна па той прычыне, што ў іх **няма паэтычнага таленту»**.

Аднак, як жа даведацца, ці ёсць у таго ці іншага паэта талент? У каго аб гэтым спытаць, каб дарэмна не пераводзіць паперу, не марнаваць час? На нашу думку, зноў-такі мае рацыю М. Ісакоўскі, калі зазначае, што «талент раскрываецца — і павінен раскрывацца — **па волі яго носьбіта,** а між іншым **не па прадбачаннях «пабочных асоб»**, хаця б і аўтарытэтных».

Чалавек нараджаецца з талентам і на працягу ўсяго жыцця развівае і шліфуе яго.

У нашым універсітэце ёсць шмат студэнтаў, якія прэтэндуюць на званне паэта. Творы адных больш дасканалыя, другіх — зусім слабыя. Аднак не трэба рабіць паспешлівых вывадаў, заявіўшы, што чые творы слабейшыя, той не мае паэтычнага таленту. Усе, нават і вялікія паэты, пачыналі з вузкай сцяжынкі, са слабых вершаў, а затым выходзілі на шырокую дарогу літаратурнага жыцця.

У сваім артыкуле мы не ставім задачу вызначыць талент пачаткоўцаў універсітэта, а толькі ўказаць на некаторыя іх памылкі і лепшыя бакі творчасці, якія ў пэўнай ступені маюць дачыненне да таленту і здольнасцей.

Даўно на паэтычнай ніве працуе студэнт IV курса гісторыка-філалагічнага факультэта **Аляксандр Дуброўскі.** Тэматыка яго твораў разнастайная: філасофскія разважанні аб сэнсе жыцця, аб звароце ў краіну дзяцінства, аб каханні і дружбе.

**...Сказала слова**
**Вечнае, святое,**
**Прайшоўшае праз войны**
**І праз смерць.**
**І я адчуў адразу**
**Шчасце тое,**
**Што людзі**
**Усе жадаюць мець.**

У многіх вершах Дуброўскага адчуваецца цяпло, завершанасць паэтычнага радка, аднак, гледзячы на яго даволі вялікую практыку, хацелася б чакаць ад паэта значных поспехаў.

**Анатоль Зэкаў** — пачатковец з меншым паэтычным стажам, але ў яго паэтычнай скарбонцы ёсць многа знаходак. Чытач знаёміўся з вершамі паэта на старонках «Гомельскага ўніверсітэта», «Гомельскай праўды», рэспубліканскіх газет і часопісаў.

Таксама плённа працуе **Святаслаў Крупенька.** Аднак яго апошнія пародыі, на наш погляд, удаюцца лепш, чым лірычныя вершы. Хочацца, каб аўтар дакладней мэтанакіроўваў сэнс сваіх пародый, каб накіроўваў сатыру ў бок недахопаў.

Вершы пішуць, як вядома, не толькі філолагі, а і гісторыкі, фізікі, біёлагі, матэматыкі...

**Ніна Казюліна** — прадстаўнік механіка-матэматычнага факультэта (IV курс). Многія творы пачынаючай паэтэсы заслугоўваюць увагі. Хаця яны яшчэ не зусім паэтычна дасканалыя, але чытаючы іх, адчуваеш, што аўтар знаходзіцца ў пастаянным пошуку — шукае сябе і ў паэзіі, і ў жыцці:

**На мир смотрю я слишком**
**прямо,**
**С поспешной лёгкостью**
**беру**
**Его пороки и обманы,**
**И боль его, и красоту.**

За глыбокім сэнсам і меладычным рытмам у гэтым вершы амаль не заўважаюцца недакладныя рыфмы (прямо — обманы, беру — красоту). Прываблівае ў вершах Казюлінай пачуццё лірычнага героя, аб якім аўтар гаворыць шчыра і проста.

У вершах **Сямёна Шыкуна,** студэнта трэцяга курса гісторыка-філалагічнага факультэта, ёсць шмат прыгожага і новага. Але прыгожае — не новае, а новае — не прыгожае. З намі будуць згодны чытачы, калі ўбачаць такія радкі:

Изогнулся фонарь донельзя
**шейкой чайника**
**и заваркой** на нас пролился
будто нечаянно... (выдз. намі — А. Л., А. Л.)

Сапраўды, аўтарам створаны новыя «вобразы». Параўнанні, якімі пабудавана яго «вобразная» сістэма, не апраўдваюць сябе. Хіба можна параўнаць, скажам, чыстае святло з чорнаю густою заваркаю? Нельга, як і нельга сказаць, што гэта паэзія. Многа вершаў у Шыкуна не маюць ідэйнага зместу, таму што стварэнне вобразаў у яго самамэта. Іншы верш імі так загрувашчаны, што можна сказаць: вобраз на вобразе едзе і вобразам пагаляе. Тое ж самае заўважаецца і ў «культуры» слова ў творах Сямёна.

Як вядома, **раса** — сімвал чысціні і светласці ў паэзіі. Аднак у што ператварыў Шыкун яе ў вершы «Городскому любителю природы»:

Ходи, что б юная **роса**
Ног не **запачкала.**
Откушай лес, но чтоб сосна
Комок не выколачивала-
(падкр. намі)

Іншая справа, калі б гэтыя словы гучалі з вуснаў героя верша, а не — аўтара. Сямёну Шыкуну трэба многа працаваць над словам і зместам верша.

Такое пажаданне датычыцца многіх пачаткоўцаў. У нашым артыкуле мы не змаглі разгледзець палавіны твораў усіх тых, хто з'яўляецца членам аб'яднання «Росквіт», якое створана пры шматтыражнай газеце. Варта было б абмеркаваць творы У. Лапіцкага, М. Лістапада, М. Камароўскага, Н. Пінчук, І. Багдановіч, М. Кузьменка і многіх іншых. Адны з іх пішуць добра, другія— горш. Каб дабіцца ж значных поспехаў — яшчэ раз скажам, — трэба шмат працаваць.

Пісаць вершы — нялёгкая справа. Вось што аб гэтым сказаў лаўрэат Ленінскай прэміі, народны паэт Дагестана Расул Гамзатаў:

**Вершина далёкая кажется**
**близкою.**
**С подножья посмотришь —**
**рукою подать,**
**Но снегом глубоким, тропой**
**каменистою**
**Идёшь и идёшь, а конца**
**не видать.**
**И наша работа не хитрою**
**кажется.**
**А станеш над словом**
**сидеть-ворожить,**
**Не свяжется строчка, и**
**легче окажется**
**Взойти на вершину, чем**
**песню сложить.**

**А. ЛОЗКА,**
**старшыня літаб'яднання «Росквіт».**
**А. ЛАПІЦКІ,**
**студэнт філфака.**

# ІДЗЕ ВЯСНА



**Трашчаць лядовыя замкі**
**Пад весняю паводкай.**
**Імкнецца ў плынь жыцця-ракі**
**Мая душа, як лодка.**

**Алесь ЛОЗКА.**

**Паэтычна-літаратурнае аб'яднанне ўніверсітэта «Крыніца» карыстаецца папулярнасцю ў Гомелі. Маладых паэтаў запрашаюць да сябе ў госці рабочыя прадпрыемстваў, студэнты, школьнікі — усе тыя, хто цікавіцца паэзіяй, любіць дасціпнае мастацкае слова. Варта толькі сказаць, што за мінулыя два тыдні члены аб'яднання выступілі перад вучнямі 8, 16, 27, 32 сярэдніх школ горада.**

**Маладыя паэты не толькі чытаюць свае творы, але і расказваюць пра пісьменнікаў Гомельшчыны, пра тых паэтаў, якія некалі вучыліся ў нашай вну. Часта на такіх сустрэчах можна ўбачыць пачынаючых паэтаў універсітэта Ніну Пінчук, Міколу Лістапада, Сямёна Шыкуна, Святаслава Крупеньку, Міколу Камароўскага, Уладзіміра Лапіцкага, Анатоля Зэкава, Аляксандра Дуброўскага і Алеся Лозку.**

**НА ЗДЫМКУ: цікавая размова адбылася пасля выступлення маладых паэтаў універсітэта з вучнямі СШ № 8.**



## СПОРТ

# ВЫДАТНЫЯ СЕКУНДЫ

Нядаўна ў г. Маладзечна праходзілі зімовыя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы на прыз газеты «Физкультурник Белоруссии». У бегу на 60 метраў з перашкодамі выдатна выступіў студэнт ГДУ Фёдар Ключнікаў. На фінішы ён быў першым з вельмі высокім вынікам — 7,8 секунды.

Гаворачы пра перамогу Ф. Ключнікава, заслужаны майстар спорту А. Юлін адзначыў, што Фёдар летам можа паказаць у бегу на 110 метраў з перашкодамі вынік міжнароднага класа — лепшы за 14 секунд.

# НОВЫЯ ПЕРАМОЖЦЫ

Закончыліся спаборніцтвы яшчэ па аднаму віду круглагадовай студэнцкай універсіяды. Пераможцаў вызначылі валейбалісты. На пляцоўцы не мелі сабе роўных студэнты чацвёртага курса факультэта фізвыхавання. Другое месца дасталося першакурснікам, трэцяе — другакурснікам гэтага ж факультэта.

Сярод жаночых каманд перамогу святкавалі спартсменкі эканамічнага факультэта. Другімі прызёрамі сталі валейбалісткі чацвёртага курса факультэта фізвыхавання, трэцімі — дзяўчаты з мехмата.

Па суме набраных ачкоў у абодвух турнірах агульнакамандное першае месца дасталося чацвёртаму курсу факультэта фізвыхавання, другое — эканамістам, трэцяе — першаму курсу факультэта фізвыхавання. Апошнія месцы — восьмае і дзявятае — занялі геолагі і біёлагі.

**Ф. СЕМЯНЕНКА,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**

## ХАКЕІСТЫ—ДРУГІЯ

На зімовай спартакіядзе студэнтаў рэспублікі добрага поспеху дабілася каманда хакеістаў нашага ўніверсітэта. У фінальным турніры яна ўступіла толькі вопытнай камандзе Беларускага інстытута фізічнай культуры і стала другім прызёрам спаборніцтваў. У гэтым дасягненні вялікая заслуга не толькі хакеістаў, але і іх трэнера.

# НАШЫ ЗАДАЧЫ

Чырвоны Крыж— гэта масавая добраахвотная арганізацыя, якая ў сваёй паўсядзённай рабоце дабіваецца паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў аўдыторый, лабараторый, студэнцкіх інтэрнатаў і тэрыторыі ўніверсітэта. Яна дапамагае органам здароўя ў правядзенні прафілактычных мерапрыемстваў, медыцынскага абслугоўвання і па гігіенічнаму выхаванню студэнтаў.

У мінулым годзе наша краіна адзначыла залаты юбілей ордэна Леніна Саюза таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

Актывісты Чырвонага Крыжа нашага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі правялі значную работу ў галіне прапаганды медыцынскіх і гігіенічных ведаў сярод студэнцкай моладзі. З гэтай мэтаю шырока выкарыстоўваўся насценны друк, шматтыражка «Гомельскі ўніверсітэт». Актыўнымі членамі ўніверсітэцкага таварыства з'яўляюцца кандыдат медыцынскіх навук В. П. Дзядзічкін, дацэнты А. І. Павук, Ф. Ф. Ганчаль і іншыя. За 1973 год імі было надрукавана больш 20 артыкулаў. Шырока выкарыстоўваецца кіналекторый кафедры грамадзянскай абароны. У прыватнасці, Я. К. Дубініна на грамадскіх пачатках правяла за мінулы год 278 кінасеансаў, на якіх прысутнічала больш 5.000 студэнтаў.

Вялікая ўвага ўдзялялася ўцягненню студэнцкай моладзі і супрацоўнікаў універсітэта ў рады таварыства Чырвонага Крыжа. Цяпер наша арганізацыя налічвае больш 4.000 членаў, у тым ліку каля 500 супрацоўнікаў універсітэта.

Адной з галоўных задач таварыства Чырвонага Крыжа з'яўляецца ўцягненне студэнцкай моладзі ў армію донараў Савецкага Саюза. З вялікай актыўнасцю і разуменнем свайго абавязку ў нашым універсітэце быў праведзены ў сакавіку 1973 года «Дзень донара», які прайшоў пад дэвізам «Кроў—у імя здароўя!». Тады 644 юнакі і дзяўчыны здалі бясплатна кроў. За шматразовую здачу крыві 8 донараў былі ўзнагароджаны значкамі «Донар СССР». Сярод іх — таварышы Радзіёнаў, Кір'янаў, Крыўцоў, Аўраменка, Лапіцкая, Драгуноў, Сасноў і Разуменка.

Кожны год на раённых спаборніцтвах наша санітарная дружына займае прызавое месца.

Вялікія і адказныя задачы стаяць перад пярвічнай арганізацыяй Чырвонага Крыжа ўніверсітэта ў чацвёртым годзе дзевятай пяцігодкі. Трэба значна актывізаваць прапаганду медыцынскіх і санітарна-гігіенічных ведаў сярод студэнцкай моладзі і выкладчыкаў універсітэта, актывізаваць работу ўніверсітэта «Здароўе», паспяхова правесці падпіску на часопіс «Советский Красный Крест». Медсёстры запасу грамадзянскай абароны павінны прыняць актыўны ўдзел у дапамозе органам аховы здароўя па нагляду за хворымі дома, у інтэрнатах.

У 1974 годзе кожны супрацоўнік і студэнт нашага ўніверсітэта павінен быць членам таварыства Чырвонага Крыжа, а колькасць донараў давесці ва ўніверсітэце да 1500.

У кожным студэнцкім будаўнічым атрадзе трэба падрыхтаваць не менш 10—15 інструктараў санітарных пастоў, набыць усё неабходнае для аказання першай медыцынскай дапамогі.

Мы павінны падрыхтаваць добрую санітарную дружыну для ўдзелу ў раённых спаборніцтвах, 400 інструктараў па нагляду за хворымі дома і 20 санітарных інспектараў, якія будуць весці кантроль за работай буфетаў і студэнцкіх сталовых.

Для тэрміновага аказання даўрачэбнай медыцынскай дапамогі неабходна актывізаваць работу санпастоў.

Актыў таварыства Чырвонага Крыжа ўніверсітэта запэўніў прэзідыум раённага камітэта Чырвонага Крыжа, што кантрольныя заданні будуць выкананы датэрмінова — да 1 мая 1974 году.

**І. СЯРОГАЎ,**
**кандыдат медыцынскіх навук, намеснік старшыні таварыства Чырвонага Крыжа ўніверсітэта.**
**В. ЛІЗУНОВА,**
**кандыдат медыцынскіх навук, адказны сакратар таварыства.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, мясцком, кафедра нямецкай і французскай моў ГДУ выказваюць спачуванне старшаму выкладчыку кафедры БРАЖЭЎСКАЙ Альбіне Андрэеўне з выпадку смерці яе БАЦЬКІ.**

АЗ 02144 **«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат — 300×420 мм. Тыраж 2000 экз.**
Заказ 1996